Цемрык Велет



...я веру толькі тату й маме,
усе астатнія – пластылін...

# Я вяртаюся ў горад

### Мроя

трава ня вырасла а вырасьлі трамваі
павылазілі ня кветкі а крыжы
а тэмы якія ўсіх турбавалі
пайшлі на ежу для душы
азірацца і глядзець
як цягае слоту трактар
вось бы раптам пасівець
у гадоў пятнаццаць

### Нешта ў лесе вялікае здохла

нешта ў лесе вялікае здохла:
цэлы дзень з сякерамі ў лесе а не ў двары
нават кабеты забыліся бялізна пасохла
дзеці на ўскрайку жытла скубуць

бонпары
нешта ў лесе вялікае здохла:
птушкі глядзяцца ў люстра каляін
іх не чуваць і талерантныя блохі
сабак не чапаюць крыкнеш: гарым
нешта ў лесе вялікае здохла:
ніхто не заўважыць а наадварот
цябе папікне няведама ў чым і можа
выкіне моўчкі за гнілы плот
нешта ў лесе вялікае здохла:
пэўна таму я часам сумны такі
часам вясёлы але ў поўню
пацягнуся ў лес далей ад касы й сахі

## МІЛЫ ТОЙ КУТОК, ДЗЕ РЭЗАЛІ ПУПОК

мілы той куток, дзе рэзалі пупок,
дзе ты хварэў і плакаў у прадоньні,
дзе рабіў свой першы крок
уздоўж зімовага дня на падваконьні
там і гадаваўся – глядзеў у вакно:
вострыя дрэвы рэзалі вочы
цябе адвучылі цярпець прыгажосьць
фея й геолаг з чорнае ночы
цябе навучыў знаёмы вар'ят
баяцца дзьвярэй і суседзяў
ня есьці з рук чужых шакалад
і ня браць у сяброў карамелькі
замшэлы дзіцячы садок
даў навуку болю й чаканьня
ён быў ніякім нібыта знарок
і нагадваў хутчэй лякарню
мяне вучыла марозіва ў краме
гнілыя галубы ў асеньнім лісьці
таму я веру толькі тату й маме,
усе астатнія – пластылін...

*   *   *

я вяртаюся ў горад
у якім так хрэнова
што ня хочацца верыць
у дзікі сонечны бляск
што ня хочацца стацца

чымсьці больш непатрэбным
чым ягоны сьметанковы жыхар

я вяртаюся ў горад
дзе баішся будынкаў
што абрынуцца могуць
на цябе у кожны міг
і тады застанешся
пад руінамі вечнымі
і ніколі ня вернешся ў горад з-пад іх

я вяртаюся да гораду доўга
нават калі знаходжуся ў ім
і вяртаньне перарастае ў голад
што будуе дарогу, замыкаецца колам
і ў разорах душы ставіць пасткі
й заставы ДАІ

## АПОШНІ

на апошняй вуліцы у апошняй краіне
у апошнім доме на апошнім паверсе
верагодна апошні верагодна забыты
на апошняй цыдулцы вымалёўвае
вершык
так апошні крык над апошняй разорай
рвецца разам апошнім знарок дагары
за апошняю мэтай у апошнім балоце
дзе здыхаюць званы і рыпяць дудары
так апошнія людзі чуюць нешта апошнімі
і няздольныя апошняе зразумець
застаецца апошняе рэха над пожняю
як апошні радок
кропка
куля
канец